

# ЖАМОЙЦІН Аляксандр Адольфавіч

Нарадзіўся 8 мая 1935 года ў в.Самаравічы Зэльвенскага раёна.

З 1953 года працаваў паляводам. Пасля вяртання з тэрміновай службы ў арміі быў накіраваны на курсы ў Жыровіцкі тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі (цяпер – Жыровіцкі дзяржаўны аграрна-тэхнічны каледж), затым завочна закончыў агранамічнае аддзяленне гэтага ж тэхнікума. Па заканчэнні тэхнікума з 1964 г. па 1974 г. узначальваў вытворчы ўчастак калгаса “Прагрэс” Зэльвенскага раёна, адказваў за вытворчасць на амаль 1000 гектараў зямлі. Стаў ініцыятарам стварэння механізаваных звёнаў па вырошчванні зерневых і прапашных культур, выкарыстоўваў перадавыя агранамічныя прыёмы. За час яго работы загадчыкам участкам ураджайнасць вырасла з 6 да 38 цэнтнераў зерневых з гектара. Адначасова быў дасягнуты ўраджай да 200 цэнтнераў бульбы і 300 цэнтнераў цукровых буракоў.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 13 снежня 1972 года за вялікія поспехі, дасягнутыя ў павелічэнні вытворчасці і продажу дзяржаве зерня, цукровых буракоў і іншых прадуктаў земляробства і праяўленую працоўную доблесць на ўборцы ўраджаю Жамойціну А.А. прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем ордэна Леніна і Залатога медаля “Серп і Молат”.

З 1974 года – старшыня адсталага калгаса “Маладая гвардыя” Зэльвенскага раёна, які за тры гады работы здолеў вывесці ў перадавікі. Ураджайнасць зерневых вырасла з 21 да 24,5 цэнтнераў з гектара, бульбы – з 109 да 167, цукровых буракоў з 224 да 248 цэнтнераў, вытворчасць мяса на 100 гектараў плошчаў вырасла з 64 да 86,2 цэнтнера, а малака з 380 да 411 цэнтнераў. Рэнтабельнасць гаспадаркі ўзрасла з 1,6% да 17%.

З 1980 г. па 1995 г. – намеснік старшыні калгаса імя Дзяржынскага.

Выбіраўся членам бюро райкама партыі.

Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнам “Знак Пашаны” і медалямі. Занесены ў Кнігу Славы Зэльвенскага раёна (2007).